ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1984

7 ЧЭРВЕНЯ

ЧАЦВЕР

№ 20 (1433)

Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з 1922 года.

"Беларускі універсітэт" тэлетайп
• Учора • Сёння • Заўтра •

## ЛЕТНІЯ КАНІКУЛЫ

замежныя студэнты, што вучацца ў нашым універсітэце, змогуць правесці ў экскурсіях па Маскве, Ленінградзе, Баку, Кіеве, Ерэване, Ташкенце, Кішынёве, Валгаградзе і Іркуцку. Да паслуг замежных студэнтаў — дамы адпачынку «Адлер» і «Нарач». Тыя, хто хоча загартаваць сябе фізічна, знайсці новых сапраўдных сяброў, змогуць папрацаваць, адпачыць і цікава правесці свой час у інтэрнацыянальным лагеры працы і адпачынку «Любань». Для аматараў падарожжаў арганізаваны аўтапоезд па Азербайджанскай і Узбекскай ССР.

З. АЛЯШКЕВІЧ.

## У ФОНД МІРУ

былі пералічаны грошы, сабраныя на канцэрце, які даў у актавай зале універсітэцкі хор народнай песні выкладчыкаў і супрацоўнікаў. Гэтым удзельнікі мастацкай самадзейнасці універсітэта ўнеслі свой пасільны ўклад у справу захавання міру.

Л. НЯХАЙ.

## АБАРОНА КУРСАВЫХ

работ студэнтамі 3-х і 4-х курсаў прайшла на кафедры радыёфізікі факультэта радыёфізікі і электронікі. Добрых вынікаў у навуковай рабоце дасягнулі студэнты 4 курса С. Палячонак і У. Рубанік. Іх работы ў галіне радыёфізікі звышвысокіх частот будуць укаранёны на прадпрыемствах Масквы і Ленінграда, а работа С. Палячонак прадстаўлена на Усесаюзны конкурс.

З. АЛЯКСАНДРАВА.

## ПРЭЗІДЫУМ

студэнцкага прафкома разгледзеў практыку размеркавання месц у студэнцкіх інтэрнатах і назначэння стыпендый на механіка-матэматычным і фізічным факультэтах. З паведамленнямі выступілі І. Дробыш — старшыня прафбюро мехмата і У. Суслаў—старшыня прафбюро фізфака.

Па пытанню арганізацыі агляду-конкурсу на лепшую пастаноўку спартыўна-масавай работы ў студэнцкіх інтэрнатах заслухана інфармацыя старшыні спартыўнага клуба А. С. Балдзіна.

П. ЛАПЦЁНАК,
намеснік старшыні студэнцкага прафкома.

● ФОТА ТЫДНЯ ●



## У НАС СЕСІЯ...

СОНЕЧНЫ зайчык ветліва пагладзіў дзяўчыну па косах:

— Прывітанне! Ты чаго тут сядзіш?

На стале ляжала раскрытая кніжка. Дзяўчына так зачыталася, што нават не заўважыла госця. Прышэльцу гэта вельмі не спадабалася. Ён нецярпліва пракаціўся па дзявочых руках, зірнуў на гадзіннік, бліснуў на старонку кніжкі і адбіўся на твар дзяўчыны:

— Ты чаму не хочаш мне адказваць? — гнеўна спытаў ён, пераліваючыся залатым бляскам са старонкі на старонку.— Няўжо не цікава са мной пагутарыць?

Дзяўчына маўчала.

Ад здзіўлення ў зайчыка паляцелі бліскавіцы ў розныя бакі, і тут на яго нарэшце звярнулі увагу.

— Не-не, — замахала рукамі дзяўчына. — Проста мне няма калі, у нас се-сі-я...

Так і не ўдалося гарэзе пазнаёміцца з першакурсніцай філалагічнага факультэта Алай Ушак. Студэнтцы было не да яго: падрыхтоўка да заліку па замежнай літаратуры — галоўней.

(Аб тым, як рыхтуюцца да сесіі іншыя студэнты, вы можаце паглядзець на трэцяй старонцы нумара).

● КАМСАМОЛЬСКАЕ ЖЫЦЦЁ ●

# ДАЙСЦІ ДА КОЖНАГА

**Нядаўна адбыўся IV пленум камітэта камсамола універсітэта. На парадку дня — пытанне «Аб паляпшэнні кіраўніцтва пярвічнымі камсамольскімі арганізацыямі, павышэнні іх баявітасці ў святле рашэнняў XXVI з'езда КПСС і задачы камсамольскай арганізацыі універсітэта, якія вынікаюць з прамовы Генеральнага сакратара ЦК КПСС, Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР К. У. Чарненкі на Усеармейскай нарадзе сакратароў камсамольскіх арганізацый».**

**У прэзідыуме пленума — прарэктар універсітэта Л. М. Давыдзенка, старшыня савета ветэранаў І. В. Марчанка, інструктар Мінскага АК ЛКСМБ Ч. Шульга, члены бюро камітэта камсамола універсітэта.**

З ДАКЛАДАМ выступіў намеснік сакратара камітэта камсамола М. Міхалап. Ён адзначыў, што сёння неабходна канкрэтная размова аб паляпшэнні форм і метадаў дзейнасці, стылю работы камсамольскай арганізацыі універсітэта. Наша асноўная задача — дайсці да кожнага камсамольца, зрабіць усё, каб ніводзін студэнт не выпаў з поля зроку камсамольскай арганізацыі.

Нягледзячы на работу, якая праводзіцца ў гэтым напрамку камітэтам камсамола БДУ імя У. І. Леніна, далёка не ўсё яшчэ добра. На факультэтах не захоўваецца структура камсамольскіх бюро груп. На гістарычным факультэце ў шэрагу акадэмічных груп адсутнічаюць аргсектары, у той жа час там адначасова функцыяніруюць ідэалагічны, ваенна-патрыятычны, культмасавы сектары. Адсутнасць належнай увагі да арганізацыйнай работы прыводзіць да парушэння Статута ВЛКСМ.

Нашы пярвічныя камсамольскія арганізацыі не заўсёды могуць вылучыць галоўныя задачы ў сваёй дзейнасці і знайсці канкрэтныя шляхі іх вырашэння. У сваёй рабоце нам неабходна рашуча пазбаўляцца ад фармальных лідэраў і рабіць гэта тэрмінова, не чакаючы справаздач і выбараў. Толькі тады мы зможам зрабіць па-сапраўднаму цікавым камсамольскае жыццё ў пярвічных камсамольскіх арганізацыях.

Камітэт камсамола універсітэта заўсёды шукае шляхі павышэння пачуцця калектывізму, увасаблення ў жыццё прынцыпу «адзін за ўсіх, усе за аднаго». Гэтаму і садзейнічаюць укаранёная ў нас сістэма калектыўных даручэнняў і эксперымент па прызначэнню стыпендый на філалагічным і механіка-матэматычным факультэтах.

Многія недахопы ў нашай рабоце з'яўляюцца вынікам дрэннай падрыхтоўкі камсамольскага актыву, гавораць аб недастатковай рабоце з кадрамі. Пэўная работа ў гэтым напрамку вялася і вядзецца. Камітэтам камсамола універсітэта праведзена трохдзённая вучоба камсамольскага актыву, вучоба сакратароў камсамольскіх арганізацый груп. У іх рабоце прынялі ўдзел адказныя работнікі апарату ЦК КПБ, ЦК ЛКСМБ, Мінскага АК ЛКСМБ, вядучыя вучоныя рэспублікі. Добра працуе школа камсамольскага актыву на механіка-матэматычным, філалагічным, гістарычным факультэтах, факультэце прыкладной матэматыкі. У той жа час не можа задаволіць нас работа гэтых школ на біяфаку і фізічным факультэце.

Плённасць камсамольскай работы залежыць ад арганізаванасці, парадку, дысцыпліны. У сувязі з гэтым усё большыя патрабаванні прад'яўляюцца да нашых актывістаў. Ёсць у нас заўвагі да некаторых членаў камітэта камсамола БДУ. Слаба дзейнічае сектар работы з І курсам (адказная С. Канаш), сектар новага прыёму (І. Траццяк), сектар сацыялістычнага спаборніцтва (А. Ваганаў). Няма дысцыпліны ў штабах працоўных спраў факультэтаў журналістыкі і радыёфізікі, фізфака.

Нягледзячы на гэтыя недахопы, дзесяцітысячны камсамольскі атрад універсітэта гатовы выканаць усе задачы, якія стаяць перад ім сёння, таму што ёсць у нас такія камсамольцы, якія не шкадуюць ні сіл, ні часу для работы Гэта А. Самуйліч, Г. Бяляк, У. Анацка, Т. Грыбко і многія іншыя. Мы ганарымся імі і ставім іх у прыклад.

На пленуме выступілі І. Крыштан — сакратар камітэта камсамола гістфака, А. Шыбут — старшыня штаба «Камсамольскага пражэктара» універсітэта, І. Шарашкіна — намеснік сакратара камітэта камсамола механіка-матэматычнага факультэта, Ю. Пазняк — сакратар камсамольскай арганізацыі выкладчыкаў і супрацоўнікаў. Перад удзельнікамі пленума выступіў старшыня савета ветэранаў універсітэта І. В. Марчанка.

Пленум пастанавіў прыняць да кіраўніцтва і выканання ўказанні, якія ўтрымліваюцца ў прамове Генеральнага сакратара ЦК КПСС, Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР таварыша К. У. Чарненкі на Усеармейскай нарадзе сакратароў камсамольскіх арганізацый.

**Ю. ВАРАТНІЦКІ,**
**кіраўнік прэс-цэнтра камітэта камсамола.**

## ● МЯСЦОВЫ ДРУК: ПРАБЛЕМЫ І ПОШУКІ ●

# КАДРЫ ДЛЯ ГАЗЕТЫ

ЖУРНАЛІСЦКІЯ КАДРЫ рыхтуюць у краіне 23 універсітэты. Але ў раённых, гарадскіх газетах іх усё ж недастаткова. У чым тут справа?

Адна з прычын, на наш погляд, заключаецца ў тым, што факультэты і аддзяленні ва універсітэтах вялі падрыхтоўку журналістаў наогул і менш за ўсё для работы ў шматтыражным і раённым друку. Зараз правільна ставіцца вельмі адказная задача — існуючую сістэму падрыхтоўкі журналістаў сарыентаваць у першую чаргу на задавальненне патрэб у кадрах раённых і гарадскіх газет. Рашэнні чэрвеньскага (1983 г.) Пленума ЦК КПСС нацэлілі прафесарска-выкладчыцкі састаў на паскарэнне ў адпаведнасці з патрабаваннямі часу перабудовы вучэбна-выхаваўчага працэсу, якая на факультэце журналістыкі БДУ імя У. І. Леніна пачалася некалькі гадоў назад. У чым гэта заключаецца?

Перш за ўсё ўнесены карэктывы ў вучэбны працэс: тэматыка дыпломных і курсавых работ ахоплівае зараз асноўныя праблемы нізавога і мясцовага друку; уведзены спецкурсы і семінары, якія больш глыбока раскрываюць практыку раённых газет; прадуманы меры, накіраваныя на максімальнае зблізкэнне вучэбнага працэсу са штодзённым жыццём сродкаў масавай інфармацыі. Супрацоўнікі факультэта імкнуцца даць такі аб'ём ведаў студэнтам, каб яны, прыйшоўшы ў рэдакцыю, адразу ж маглі ўключыцца ў творчы працэс і працаваць на поўную сілу.

Дасягненню гэтай мэты ў многім садзейнічае і вытворчая практыка студэнтаў, якая сёння праходзіць у рэдакцыях больш чым пяцідзесяці раённых газет. Некаторыя студэнты пры размеркаванні выказваюць жаданне працаваць у тых рэдакцыях, дзе праходзілі практыку, прыходзяць і персанальныя заяўкі. Лепшыя публікацыі студэнтаў штогод адзначаюцца прэміямі Саюза журналістаў рэспублікі, што з'яўляецца таксама добрым стымулам для творчасці.

У мінулым годзе з 50 студэнтаў 30 прыехалі на факультэт па рэкамендацыях рэдакцыйных калектываў. Натуральна, што пры размеркаванні выпускнікоў у першую чаргу прымаюцца да ўвагі заяўкі гэтых калектываў. У мінулым годзе накіравана ў раёны 35 выпускнікоў, а сёлета — 33. За апошнія пяць гадоў факультэт рэкамендаваў для работы ў мясцовым друку каля 70 працэнтаў ад агульнай колькасці выпускнікоў. Але, на жаль, далёка не ўсе засталіся там.

Мы паставілі мэту выявіць прычыну. Галоўная — адсутнасць жылля. Некаторыя мясцовыя органы не лічаць клопаты аб стварэнні нармальных умоў для жыцця і працы журналістаў сваёй справай.

На факультэце вучыцца і пэўная колькасць студэнтаў з Мінска, абласных цэнтраў. Некаторыя з іх па розных прычынах застаюцца ў сталіцы рэспублікі, абласных цэнтрах. Тут хацелася б параіць Дзяржкамвыдату БССР больш строга кантраляваць выкананне рашэнняў камісій па размеркаванню маладых журналістаў. Справа ў тым, што многія з іх уладкоўваюцца на работу не па спецыяльнасці, ідуць у гандаль, канцылярыі, куды папала — толькі далей ад газеты.

Праблема гэта не сённяшняга дня. Да вырашэння яе падступаліся з розных бакоў. Быў уведзены, напрыклад, творчы конкурс, на які ўскладваліся вялікія надзеі, але мэта яго, на жаль, не заўсёды дасягаецца.

Справа ў тым, што, перш чым матэрыял прэтэндэнта на журналісцкую прафесію паявіцца ў друку ці ў тэлерадыёперадачы, ён, як правіла, праходзіць адпаведную апрацоўку ў аддзелах рэдакцый. Бывае, што ад аўтарскага тэксту ні радка не застаецца. Але матэрыял надрукаваны, глядзяць яго на факультэце ў гатовым выглядзе, і конкурсная камісія часта дае яму добрую ацэнку. Глядзіш, такіх выразак у абітурыента назапасілася нямала. Тады, калі ён нават на тройку з нацяжкай піша пісьмовую работу, у залік з добрай перавагай пойдуць публікацыі, і конкурсная камісія (а там таксама жывыя людзі, часам з добрымі сэрцамі) вырашае: няхай здае ўступныя экзамены.

Праходзіць год, паўтара, і аказваецца, што чалавек прамахнуўся з выбарам прафесіі. Можна такое прадухіліць? Думаецца, можна. Перш за ўсё патрэбна павысіць адказнасць за даручаную справу членаў конкурсных камісій. Яны павінны самі разумець, што не робяць дабро выбіраючаму прафесію, а наносяць цяжка папраўную шкоду, калі забываюць аб прынцыповасці.

І яшчэ адна акалічнасць. Той, хто паступае на факультэт, прад'яўляе характарыстыку-рэкамендацыю той ці іншай рэдакцыі. Без яе абітурыента не допускаюць да конкурсу. Але не ўсе рэдакцыі адносяцца сур'ёзна да выдачы такіх дакументаў.

Вось прыклад. Рэдакцыя слуцкай раённай газеты рэкамендавала для паступлення на факультэт журналістыкі абітурыента Т. Яму ўдалося паступіць. На працягу пяці гадоў вучыўся так сабе, парушаў дысцыпліну, але сур'ёзнай падставы для адлічэння не падаваў. Паўстала пытанне: куды яго накіраваць пасля заканчэння універсітэта, якую рэдакцыю «ашчасліваць»? Рашэнне камісіі па размеркаванню было аднадушным: накіраваць у Слуцк. І што ж? Рэдакцыя адмовілася ад свайго рэкамендуемага!

Напэўна, няправільна, што рэдакцыі не нясуць адказнасці за свае рэкамендацыі, не цікавяцца, за рэдкім выключэннем, як вучацца іх падапечныя, як паводзяць сябе.

Час, думаецца, у кожным раёне весці канкрэтную, планавую, мэтанакіраваную падрыхтоўку журналісцкіх кадраў. Гэта азначае, што і райком партыі, і рэдакцыя газеты павінны бачыць перспектыву руху кадраў, загадзя рыхтаваць рэзерв. З улікам гэтага можна падбіраць з ліку актыўных, маладых, здольных рабселькораў кандыдатаў на вучобу ва універсітэце.

Нямала патрэбна зрабіць і партыйным камітэтам, і нам, выкладчыкам, каб сумесна вырашыць яшчэ адну важную задачу: паслядоўна, настойліва ажыццяўляць мэтавае накіраванне на вучобу ва універсітэты рабочай і сельскай моладзі. Важна таксама і больш дакладна вызначаць спецыялізацыю будучага супрацоўніка, рыхтаваць яго мэтанакіравана, скажам, для работы ў сакратарыяце, галіновым аддзеле, аддзеле пісьмаў і гэтак далей.

Зараз пра такое пытанне. Гарадскія школьнікі, як правіла, падрыхтаваны для паступлення ў ВНУ некалькі лепш за сельскіх. Уступныя экзмены, натуральна, здаюць яны больш паспяхова. А што адбываецца далей? Звычайна к трэцяму курсу сельскія рабяты вучацца не горш. Яны ж з задавальненнем едуць у раённыя газеты. Толькі іх можа аказацца меншасць. Што рабіць? Рэкамендаваным на вучобу рэдакцыямі раённых газет неабходна, на наш погляд, прыбаўляць пры залічэнні адзін-два балы.

Зараз дыплом журналіста ў нейкай ступені абясцэнены. Яго маюць і «расчараваныя вандроўнікі», якія так і не сталі журналістамі, блукаюць з адной работы на другую, і тыя, хто закончыў вячэрняе і завочнае аддзяленні, але не знайшлі работы па спецыяльнасці. Магчыма, магла б прынесці карысць, з нашага пункту гледжання, такая практыка: дыпломную работу выпускнік стацыянара абараняе пасля года работы непасрэдна ў рэдакцыі раённай або гарадской газеты. Выявіў там здольнасці — атрымлівай дыплом журналіста, не — бяры даведку аб тым, што прайшоў курс навучання.

Завочная і вячэрняя формы падрыхтоўкі кадраў гэтай спецыяльнасці, безумоўна, апраўдалі сябе. Але і тут не абыходзіцца без праблем. На завочным аддзяленні факультэта журналістыкі БДУ імя У. І. Леніна вучацца 407 студэнтаў, па спецыяльнасці працуюць толькі 165 з іх. Магчыма, на завочнае аддзяленне патрэбна прымаць толькі тых, хто працуе на пасадах, звязаных з газетнай творчасцю.

Рыхтаваць кадры для мясцовага друку, як бачна, не проста. Вырашэнне шэрагу праблем не пад сілу факультэтам і аддзяленням журналістыкі. Патрэбна дапамога зацікаўленых арганізацый. І чым хутчэй яна будзе аказана, тым лепш: размова ідзе аб важным і вялікім звяне сродкаў масавай інфармацыі.

**П. ТКАЧОЎ,**
**дэкан факультэта журналістыкі, прафесар;**
**І. НОВІКАЎ,**
**кар. «Праўды».**
**(«Правда» за 2 чэрвеня 1984 г.).**

## ● ДА 40-ГОДДЗЯ ВЫЗВАЛЕННЯ БЕЛАРУСІ АД НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ

# УВАГА: ВІКТАРЫНА

Пярвічная арганізацыя таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры БДУ імя У. І. Леніна праводзіць віктарыну, прысвечаную 40-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Просім адказаць на пытанні:

**1. Калі было створана Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры? Якія ў яго задачы?**

**2. Што Вы ведаеце аб рабоце пярвічнай арганізацыі БДУ імя У. І. Леніна?**

**3. Што Вы ведаеце аб гісторыі ўтварэння універсітэта?**

**4. Што Вы ведаеце аб мемарыяльных помніках і дошках, замацаваных за пярвічнай арганізацыяй таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры БДУ імя У. І. Леніна?**

**5. Якія дакументы вызначаюць мэты і задачы работы пярвічных арганізацый таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры?**

**6. Што Вы можаце расказаць пра герояў, чые імёны носяць вуліцы Маскоўскага раёна?**

**7. Раскажыце пра аднаго з удзельнікаў падполля — супрацоўніка ці студэнта універсітэта.**

Адказы дасылайце да 25 чэрвеня на кафедру англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў (корпус падрыхтоўчага факультэта, п. 14). Тры пераможцы віктарыны будуць узнагароджаны граматамі і сувенірамі.

## ● КАНФЕРЭНЦЫЯ ●

# ПРАБЛЕМЫ МАТЫВАЦЫІ

НА МІНУЛЫМ тыдні ў БДУ імя У. І. Леніна прайшла рэспубліканская навукова-метадычная канферэнцыя «Праблемы матывацыі пры авалоданні рускай мовай на розных формах навучання». Удзельнікамі канферэнцыі былі прадстаўнікі многіх вышэйшых навучальных устаноў Беларусі, а таксама саюзных рэспублік. На адкрыцці выступіў прарэктар па міжнародных сувязях кандыдат гістарычных навук А. В. Шарапа. Ён сказаў:

**— Правядзенне канферэнцый русістаў у БДУ імя У. І. Леніна стала ўжо традыцыяй. І гэта не выпадкова: у нашым універсітэце працуе вялікая колькасць русістаў. З 1962 года было выпушчана 1500 замежных спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй. 130 замежных грамадзян абаранілі дысертацыі, стаўшы кандыдатамі навук, больш за 1000 чалавек закончылі падрыхтоўчае аддзяленне.**

**У гэтай адказнай рабоце вялікае значэнне мае вывучэнне методыкі выкладання рускай мовы ў цэлым. Работай нашых русістаў мы задаволены, хаця, як і ў кожнай справе, у нас ёсць і нявырашаныя праблемы.**

Пасля канферэнцыі наш карэспандэнт **А. ВАЛЬВАЧОЎ** сустрэўся з адным з яе арганізатараў — загадчыкам кафедры рускай мовы па навучанню замежных студэнтаў асноўных факультэтаў кандыдатам філалагічных навук **В. В. РАВІЦКІМ** і задаў яму некалькі пытанняў:

**— Скажыце, калі ласка, у чым заключалася кола асноўных праблем, вырашэнню якіх была часткова прысвечана гэта канферэнцыя!**

— Важнай у метадычных адносінах з'яўляецца праблема стварэння матываў навучання замежным мовам, у тым ліку і рускай як замежнай, бо ад сілы матываў залежыць актыўнасць навучэнцаў, іх здольнасць да творчай дзейнасці. А творчая актыўнасць садзейнічае атрыманню глыбокіх ведаў, карацей кажучы, таму, да чаго імкнецца выкладчык.

З праблемай вывучэння выкладчыкам матывацыі навучэнцаў цесна звязана праблема фарміравання матывацыі, якая абумоўліваецца ўсімі сродкамі ўдасканалення вучэбнага працэсу: зместам і прэтэнзацыяй вучэбнага матэрыялу з улікам патрэб і інтарэсаў навучэнца, сістэмай грамадска-палітычнай работы і грамадска карысных відаў дзейнасці і многімі іншымі.

Вырашэнне гэтых задач дазволіць значна павысіць узровень матывацыі авалодання замежнымі студэнтамі рускай мовай.

**— Як Вы ацэньваеце вынікі канферэнцыі! Якія вывады па яе рабоце можна зрабіць ужо зараз!**

— Перш за ўсё хочацца адзначыць, што цікавасць да такіх канферэнцый год ад году расце. Усё больш шырокім становіцца кола ўдзельнікаў — вядомых спецыялістаў у гэтай галіне. Прафесар Ленінградскага універсітэта Ф. С. Шаталаў адзначыў высокі тэарэтычны і навукова-метадычны ўзровень канферэнцыі, выказаў упэўненасць, што яна з'явіцца станоўчым звяном у даследаванні матывацыйнай падрыхтаванасці замежных студэнтаў да вывучэння рускай мовы.

У шматлікіх дакладах былі абмеркаваны метады і прыёмы павышэння зацікаўленасці замежных навучэнцаў у засваенні вучэбнага матэрыялу.

Удзельнікі канферэнцыі пазнаёміліся з даследчай, навукова-метадычнай і ідэйна-выхаваўчай работай мінскіх вучоных не толькі па дакладах, але і пабывалі на адпаведных кафедрах БДУ, БПІ, БТІ, БІМСГ. І вывад можна зрабіць толькі адзін: канферэнцыя прынясе практычную карысць выкладчыкам рускай мовы як замежнай. Вывучаючы апублікаваныя матэрыялы, яны могуць выкарыстоўваць іх у сваёй рабоце, павышаць яе навукова-метадычны ўзровень.

**— Гэта канферэнцыя, зразумела, не апошняя!**

— Такога роду канферэнцыі ўваходзяць у каардынацыйны план Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР. Тэма чарговай — «Роля і месца тэкстаў па спецыяльнасці ў навучанні замежных студэнтаў-нефілолагаў». Мы таксама пастараемся правесці яе на самым высокім узроўні, і таму рыхтавацца пачнём у бліжэйшы час.



**НА ЗДЫМКУ: у час адкрыцця канферэнцыі.**

Фота **С. Плыткевіча.**

## З НАШАЙ ПОШТЫ

**Заключаны дагавор паміж Белдзяржуніверсітэтам і інстытутам народнай гаспадаркі аб супрацоўніцтве па распрацоўцы праграмнага забеспячэння ЭВМ. Адказнымі бакамі дагавора з'яўляюцца факультэт эканомікі сельскай гаспадаркі Інстытута народнай гаспадаркі імя В. В. Куйбышава і факультэт прыкладной матэматыкі БДУ імя У. І. Леніна. Студэнты старэйшых курсаў факультэта прыкладной матэматыкі будуць распрацоўваць праграмы для выкарыстання іх студэнтамі БДІНГ пры вывучэнні імі прадметаў матэматычнага характару.**

# Супрацоўніцтва «БДІНГ—БДУ»

На першым этапе плануецца распрацоўка падсістэмы прагназіравання паказчыкаў эканомікі. Істотнай рысай гэтай падсістэмы з'яўляецца тое, што яна, акрамя вучэбнага выкарыстання, будзе прыгодна, пасля адпаведнай настройкі, да функцыяніравання ў рэальных аўтаматызаваных сістэмах кіравання рознымі народнагаспадарчымі аб'ектамі. Нашы студэнты яшчэ ў сценах інстытута будуць мець магчымасць набыць навыкі выкарыстання матэматычных метадаў прагназіравання ў спалучэнні з ЭВМ пры рабоце над дыпломнымі праектамі, пры выкананні навуковых даследаванняў.

Выключна важным будзе тое, што паявіцца магчымасць выкарыстання рэальных даных аб рабоце народнагаспадарчых аб'ектаў. Справа ў тым, што заўсёды можна так падабраць умоўныя даныя, што будзе «даказана» высокая надзейнасць любога метаду прагназіравання. Працуючы ж з рэальнымі данымі, студэнт мае магчымасць аб'ектыўна ацаніць надзейнасць выкарыстоўваемага матэматычнага метаду.

Новая падсістэма прагназіравання распрацоўваецца для ЭВМ ЕС-1022. Прататыпам яе з'яўляецца выкарыстоўваемая ў нас з 1975 года сістэма праграм для ЭВМ «Мінск-32», на базе якой нашымі студэнтамі выкананы шэраг удалых навуковых даследаванняў. Тут да месца адзначыць, што праграма «КАРЭКЦЫЯ», якая шырока прымяняецца ў інстытуце для мэт «прагназіравання», выключае пошукавы характар работы. Рэзультатам яе прымянення часцей за ўсё з'яўляюцца вывады прыкладна наступнага характару: «павелічэнне рацыёну станоўча ўздзейнічае на прывагу цялят» і г. д. Такія псеўданавуковыя рэзультаты здольны толькі дыскрэдытаваць матэматычныя метады ў вачах студэнтаў і назаўсёды адбіць у іх ахвоту выкарыстоўваць матэматыку і ЭВМ у практыцы кіравання народнай гаспадаркай.

Мы спадзяёмся, што ініцыятыву ў стварэнні падсістэм вучэбна-вытворчага характару падтрымаюць усе факультэты інстытута. Тады можна будзе размаўляць аб магчымасці распрацоўкі вучэбна-вытворчай аўтаматызаванай сістэмы кіравання, насычанай матэматычнымі метадамі. Студэнты універсітэта з энтузіязмам адносяцца да гэтай работы. Вось што гаворыць, напрыклад, студэнтка 4-га курса факультэта прыкладной матэматыкі Людміла Прахарэнка:

— Гэта проста выдатна, што рэзультаты маёй курсавой работы будуць карыснымі для студэнтаў такога вядомага інстытута.

**Р. РУТКОЎСКАЯ,**
**старшы выкладчык Беларускага дзяржаўнага інстытута народнай гаспадаркі.**

# ЗАПРАШАЕ ПРАФІЛАКТОРЫЙ

«ФІЛІЯЛ БДУ, канечны прыпынак», — аб'яўляе вадзіцель. Аўтобус спыняецца на маленькай пляцоўцы, якую з усіх бакоў абступаюць дрэвы. Тут, па суседству з факультэтамі радыёфізікі і электронікі і біялагічным, размясціўся прафілакторый БДУ.

Кожны месяц у ім праходзяць курс лячэння 100—110 студэнтаў. Яны забяспечваюцца жыллём і трохразовым харчаваннем. Распарадак дня складзены так, каб у сталовую паспелі тыя, каму патрэбна на заняткі раней, і тыя, каму неабавязкова спяшацца, напрыклад, дыпломнікі. У прафілакторыі арганізавана медыцынскае абслугоўванне: ёсць кабінеты парафіналячэння, гіпнатэрапіі і электрасну, функцыянальнай дыягностыкі, масажу, усё неабходнае для падводнага і струменнага душа, кіслародных кактэйляў. З раніцы або пасля вучобы студэнты прымаюць хвойныя, марскія або валяр'янавыя ванны. Чатыры разы ў месяц могуць атрымаць кансультацыі прафесара-тэрапеўта, двойчы — урача-гінеколага, акуліста і іншых спецыялістаў.

Але давайце паспрабуем высветліць: хто ж можа карыстацца паслугамі прафілакторыя? Здаецца, адказ вельмі просты: усе, хто мае патрэбу ў медыцынскім абслугоўванні. Па рэкамендацыі галоўнага ўрача прафілакторыя М. Б. Канапелькі сюды павінны накіроўвацца студэнты з хранічным танзілітам, гастрытам, рэўматызмам, з захворваннямі органаў дыхання і сэрца. Але, на жаль, ёсць выпадкі, калі ў прафілакторый трапляюць людзі зусім выпадковыя, якія не маюць патрэбы ў лячэнні. «Значыць, патрэбна змагацца з вірусам «сімулянства», — падкажа чытач. На першы погляд так, але калі ўгледзімся, то ўбачым, што перад намі сімптом зусім іншай хваробы.

Звернемся да намесніка старшыні студэнцкага прафкома па арганізацыйнай рабоце Н. М. Туромшы, праз рукі якой праходзяць усе пуцёўкі ў прафілакторый.

— Звычайна студэнты падаюць медыцынскія карткі з заявамі ў прафбюро факультэтаў,— расказвае Ніна Міхайлаўна. — Там іх разглядаюць, пасля чаго пасяджэнне прафбюро вырашае, каму пуцёўкі найбольш патрэбны. Мы размяркоўваем пуцёўкі сярод факультэтаў. Ёсць строгі графік заезду ў прафілакторый, дзе мехмату аддаецца 11 месц, ФПМ — таксама, фізічнаму факультэту — 9, юрыдычнаму — 7, па 6 гістарычнаму і філалагічнаму, 5 месц — хімічнаму і факультэту радыёфізікі і электронікі, па 4 геаграфічнаму і біялагічнаму, 3 журфаку і 5 месц для падрыхтоўчага аддзялення.

Няхітры падлік дасць лічбу 76. А дзе астатнія?

— Дваццаць пуцёвак мы выдзяляем супрацоўнікам універсітэта, — адказвае Н. М. Туромша. — Але звычайна яны едуць не вельмі ахвотна або зусім не едуць.

Значыць, не дваццаць, а значна менш. Вось дзе адчыняюцца дзверы для «ліпавых» хворых.

Відаць, патрэбна зменшыць колькасць пуцёвак для выкладчыкаў і супрацоўнікаў, тады ўсё стане на свае месцы. Пуцёўкі, якія зараз аказваюцца лішнімі, будуць размеркаваны паміж студэнтамі, і іменна тымі, якія маюць у іх патрэбу.

Наташа Значонак і Ірына Мядзведзева, студэнткі 2 курса фізфака, з якімі я сустрэлася ў прафілакторыі, задаволены абслугоўваннем, арганізацыяй вольнага часу. Як кажуць дзяўчаты, кормяць выдатна, у корпусе ёсць каляровы тэлевізар, у пакоях — радыё, а вечарам можна пайсці на дыскатэку да радыёфізікаў або пагуляць на прыродзе.

— Тут вельмі цудоўна можна правесці месяц, — гаворыць пяцікурсніца біялагічнага факультэта (на жаль, яна не назвала свайго прозвішча). — Надзіва добразычлівы персанал. Яны робяць усё, каб прафілакторый адпавядаў свайму прызначэнню.

Значыць, праблема ў тым, каб своечасова інфармаваць студэнтаў і супрацоўнікаў аб заездах, рыхтаваць неабходную дакументацыю. Гэта, вядома, справа прафсаюзнага камітэта, абавязак кожнага праформа. Ад таго, як ён будзе выкананы, залежыць, як адпачнуць і папрвяць сваё здароўе студэнты.

Прафілакторый БДУ яшчэ малады (ён прыняў толькі пяць змен) і сутыкаецца з некаторымі арганізацыйна-гаспадарчымі цяжкасцямі. Вырашаць іх дапамагае рэктарат.

Спадзяёмся, што ў будучым і падрыхтоўка да заездаў будзе весціся ў правільным напрамку.

**Э. ОЛІНА,**
**студэнтка факультэта журналістыкі.**

# СУР'ЁЗНАСЦЬ — ПРЫКМЕТА САМАСТОЙНАСЦІ

— СТАЎЛЮ ВАМ ВЫДАТНА,— гэтыя словы не раз даводзілася гаварыць выкладчыкам, якія прымалі экзамены ў трэцяга курса аддзялення палітэканоміі.

Трэцякурснікі здалі апошні экзамен і цяпер могуць адарвацца ад падручнікаў. Курс — 20 савецкіх студэнтаў і 12 замежных. Вельмі малы, калі параўноўваць з курсамі такіх факультэтаў, як фізічны, механіка-матэматычны. Але не кожны факультэт можа пахваліцца такой колькасцю выдатнікаў на курсе. Іх тут — трынаццаць. Шмат студэнтаў вучыцца на добра і выдатна. Такі штрых: з савецкіх студэнтаў толькі адзін чалавек мае адзнаку «здавальняюча».

Дацэнт В. Г. Аляксееў застаўся задаволены ведамі студэнтаў па палітычнай эканоміі сацыялізму. Аб гэтым сведчаць выдатныя адзнакі амаль у кожнай клетцы экзаменацыйнай ведамасці.

П. Данейка, А. Гладкая, А. Сівая, В. Рыжкоўская, Н. Штрык не ўпершыню становяцца выдатнікамі. Добрасумленна адносяцца да вучобы студэнты з ГДР Анцье Хаврда і Утэ Брайдэр.

У чым сакрэт такой паспяховасці? Напэўна, у тым, што студэнты сур'ёзна адносяцца да вучобы. А сур'ёзнасць — прыкмета самастойнасці. На аддзяленне паступаюць абітурыенты, якія звычайна маюць стаж практычнай работы. Яны працавалі раней на прамысловых прадпрыемствах, у калгасах, саўгасах, служылі ў радах Савецкай Арміі.

Але гаварыць, што курс ідэальны, пакуль не трэба. Яшчэ невысокая паспяховасць у замежных студэнтаў, ёсць нездавальняючыя адзнакі. Тым не менш на факультэце спадзяюцца, што ў наступную сесію на курсе не будзе адстаючых.

**І. УЛАДЗІМІРАЎ.**

## ФОТА ТЫДНЯ




**НА ЗДЫМКАХ:** **чытальная зала Дзяржаўнай бібліятэкі імя У. І. Леніна; вось дык вычытаў нешта!.. поўнае адключэнне ад усяго навакольнага; змарылася; студэнцкія мукі...**

Фота **С. Плыткевіча.**

● ТВОЙ ВОЛЬНЫ ЧАС — ТВАЁ БАГАЦЦЕ ●

# АЛЁ, МЫ ШУКАЕМ... КАМАНДЗІРА

**Нядаўна група студэнтаў універсітэта вярнулася з зорнага паходу. Яны прайшлі на байдарках адлегласць у 150 кіламетраў. Маршрут групы праходзіў па Ігналінскіх азёрах, рэках Жаймяна і Вілія. Я папрасіла студэнтаў больш падрабязна расказаць пра свой паход.**

**— Вы ўжо не першы раз удзельнічаеце ў зорных паходах, якія сталі ў нас ва універсітэце традыцыйнымі. Чаму яны называюцца «зорнымі»!**

— У нашай краіне на дамах, дзе жывуць ветэраны або удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны, сем'і загінуўшых, гарыць чырвоная зорка. Мы ходзім па сцежках герояў, збіраем матэрыялы аб барацьбе савецкага народа супраць фашысцкіх захопнікаў. Каб успыхвалі новыя зоркі і каб гарэлі яны ярчэй і ярчэй.

**— Як утварылася ваша паходная група!**

— Калі ў мінулым годзе перад зімовай сесіяй запісвалі жадаючых пайсці ў лыжны паход, мы з радасцю пагадзіліся. Сфарміраваліся дзве групы: група другакурснікаў ФПМ і група студэнтаў-радыёфізікаў, таксама другі курс. Але перад самым паходам высветлілася, што маршрут у нас адзін і той жа, і па прапанове камандзіраў Алены Русак і Сяргея Макарэвіча мы аб'ядналіся ў адзін калектыў.

А потым, каб ісці ў водны паход, нам патрэбен быў камандзір, які мог бы павесці нас. І ў групу ўліліся Аня Бяліцкая (гістфак) і Ігар Пекар, які вучыцца ў БПІ.

**— Аня, у цябе, як у камандзіра, ці былі цяжкасці!**

— Я стала камандзірам ужо сфарміраванага калектыву. І таму, каб не пашкодзіць справе, мне даводзілася ўдвая кантраляваць свае словы і ўчынкі.

**— Што было самай вялікай радасцю ў паходзе!**

— Рызыка. Дзе, як не ў паходзе, у цяжкасцях, пазнаеш сябе, сваіх таварышаў!

**— Вы прайшлі па вадзе 150 км. Ці не надакучыла вам гэта аднастайнасць!**

— Аднастайнасці не было. Мы плылі па дзевяць гадзін у суткі, але гатовы былі плысці і больш. Стамляліся толькі ад таго, што ўвесь час даводзілася сядзець.

**— Вашы планы на будучае!**

Плануем у верасні пабываць на Каўказе. Але тут ёсць праблемы. Нам патрэбен кіраўнік, у якога ёсць вопыт паходаў больш высокай катэгорыі складанасці. Ды і група наша абнаўляецца, а таму праблемы будуць. Але спадзёмся, што мы іх вырашым паспяхова.

**Інтэрв'ю правяла А. КАВАЛЬЧУК, студэнтка ФПМ.**

# УЗЫХОДЖАННЕ

ЦІШЫНЯ ЗНІКЛА. Замест яе паявіўся нейкі асаблівы і ні з чым не параўнальны гул пад'ёму лагера. У суседняй палатцы прынялася за работу дзяжурная.

Яшчэ можна спаць, але ўсе прачнуліся і ляжаць, чакаючы, калі закіпіць чай. Пра што яны думаюць? Усе думкі скіраваны да аднаго — будучага ўзыходжання. Якім яно будзе? Зразумела, паспяховым, таму што інакш і быць не можа. Каму хочацца адступаць ад мэты?

Прыгажун Эльбрус, як ты нас сустрэнеш сёння? Розным ты бываеш: то добрым, калі ўзвышаешся сваімі беласнежнымі вяршынямі на фоне сіняга бязвоблачнага неба; то суровым і непадступным, закрытым суцэльнай сіняй заслонай, калі гуляе па тваіх схілах ураганны вецер.

Але сёння, здаецца, ён добры, а значыць, нам пашанцавала. Ідзём моўчкі, толькі зрэдку хто-небудзь перакінецца словам-другім, і зноў цішыня, якая парушаецца толькі скрыпам снегу пад нагамі. Стомленасць падкрадваецца непрыкметна, з кожным крокам усё больш і больш даючы аб сабе знаць. Пяцімінутны прывал — гэта кароткая перадышка дазваляе зняць рукзак і на нейкі час расслабіцца. Больш адпачываць нельга, кіслароду тут значна менш, чым унізе, а да вяршыні яшчэ ісці ды ісці.

Пасля пяці тысяч кіламетраў кожны крок даецца з цяжкасцю, праз кожную сотню крокаў — перадышка. Усім целам навальваешся на ледасек, і на нейкі час паяўляецца абыякавасць да ўсяго. Гэта, напэўна, ад стомленасці. Але вяршыня кліча, і зноў, крок за крокам, наперад.

З перамычкі ісці становіцца яшчэ цяжэй: крутасць схілу павялічваецца, а сілы на зыходзе. Кожны метр даецца нялёгка, хочацца легчы і не ўставаць...

Нарэшце вяршыня! Незвычайная Усходняя вяршыня Эльбруса: вялікая і амаль зусім плоская. І ў гэты момант цябе ахоплівае велізарная радасць. Ты перамог. Перамог не гару, а ў першую чаргу самога сябе, сваю слабасць.

Потым спуск. Ты вяртаешся з вяршыні са светлай радасцю на душы, таму што гэта ўжо — мінулае, а табе застаюцца ўспаміны, фотаздымкі і нясцерпная прага новых узыходжанняў.

**У. БОЛБАС, студэнт хімічнага факультэта.**




# НІ ПУХУ, НІ ПЕР'Я!

**СЕСІЯ! СЕСІЯ! СЕСІЯ...**

**Сусед па пакоі вытыркнуў галаву з-пад коўдры, млява пацягнуўся ў цёплым ложку:**

**— Ты куды ўспароўся сярод ночы? А-а... іспыт. Ні пуху, ні пер'я...—і, салодка пазяхнуўшы, перавярнуўся на другі бок — даглядаць свой перадранішні сон.**

**— На экзамен? — вочы вахцёркі глядзяць цёпла і ласкава, са спачуваннем адначасова.— Ну, ні пуху, ні пер'я.**

**Перакрыжаванне. Чырвонае святло. Свісток. Міліцыянер (і адкуль толькі ён узяўся?).**

**— Ах, вы на экзамен... Разумею, разумею. Ну што вы, які штраф. Будзьце надалей пільнейшымі. Ні пуху, ні пер'я!**

**— Хлопцы, дзяўчаты, хто першы заходзіць? Ты? Цудоўна! Ні пуху, ні пер'я! Давай...**

**— Так-так... самыя смелыя. Першыя ластаўкі. Будзем ведаць, будзем ведаць. Ну, бярыце білеты. Ні пуху, ні пер'я...**

**Сядаеш за парту, уважліва чытаеш пытанні. Раз, другі трэці... Нарэшце ўключаецца свядомасць, вяртаецца магчымасць думаць, вышукваць у глыбінях памяці адказы, выплеснуць на паперу тое, што назапасіў за ўвесь семестр.**

**Без асаблівага захаплення адкладваеш у бок білет, не такі шчаслівы, як таго хацелася... І толькі зараз паяўляецца моцнае жаданне адказаць усім, хто гэтым прыгожым, чыстым ранкам зычыў «Ні пуху, ні пер'я!»:**

**— !!!**

**Нагледзячы ні на што, адміністрацыя «ЛІФТа» шчыра віншуе чытачоў з гэтым надзвычайным святам — летняй сесіяй, зычыць шчаслівых білетаў, выдатных адказаў і лёгкай рукі выкладчыкаў!**

## ● АБ'ЕКТЫЎ СМЯЕЦЦА

УХ... СЕСІЯ ПАЧАЛАСЯ. Што рабіць студэнту, якога яна загнала ў гэты трохвугольнік «вострых» клопатаў? Угрызнуць «граніт навукі»? Ці паспрабаваць выкруціцца праз які-небудзь вугал — на шчасце іх тут аж тры: альбо «бомбы» і «шпоры» напісаць, альбо без падрыхтоўкі напралом пайсці, спадзеючыся на шанцаванне, альбо рукі апусціць, здацца на ласку выкладчыка? Што выбераш ты для сябе, студэнт?



Фота **С. Плыткевіча.**

# Што я і раблю...

**ПАВОДЛЕ М. ЖВАЛЕЎСКАГА**

КАЛІ Б я не марнаваў час, не валяўся гадзінамі на ложку ў сваім інтэрнацкім пакоі, не хадзіў бы на спатканні, не танцаваў да раніцы ў «чыталцы» на дзевятым паверсе, я быў бы працавіты, уседлівы і старанны. Я б пісаў, чытаў, канспектаваў, разлічваў, браў дадому работу, вынаходзіў, у свой час здаваў курсавыя і праходзіў практыку, сядзеў начамі і нешта вынайшаў бы, ад доўгага сядзення абавязкова нешта вынаходзіш, абараніў бы без клопатаў курсавы праект, здаў бы ў свой час усе залікі, і мяне б дапусцілі да экзаменаў, выбралі ў састаў прафбюро факультэта, прызначылі старастай курса і адказным за распаўсюджванне марак аховы прыроды. Усе пачалі б мяне паважаць, а дэкан — вітацца пры сустрэчы за руку. І ўжо тады б я гуляў, траціў час на танцы і спатканні, бавіўся за куфлем піва з сябрамі і валяўся гадзінамі на ложку, што я зараз і раблю без гэтых клопатаў.

**А. ДАНІЛЕВІЧ.**

## ● УСМЕШКІ МАСТАКА ●



## ● ІМПАРТНЫ ГУМАР

●

МНЕ ПАТРЭБЕН які-небудзь добры будзільнік, — звяртаецца пакупнік да прадаўца.

— О, у нас ёсць іменна такі, як вы шукаеце, — гаворыць прадавец. — Вось ён! Спачатку ён звоніць. Калі ж вы не прачнуліся, вые сірэна, а потым раздаецца выстрал, як з гарматы. Калі ж і пасля гэтага вы не прачнуліся, ён абдае вас халоднай вадой. І толькі потым ён звоніць і папярэджвае, што вы захварэлі.

●

— Скажы, што такое сінонім?

— Гэта такое слова, якое замяняюць другім, калі не ведаюць яго арфаграфіі.

●

Экзаменатар пытаецца ў будучага педагога:

— Адкажыце, чаму вы вырашылі стаць настаўнікам? Назавіце хаця б тры прычыны.

Студэнт адказвае:

— Чэрвень, ліпень, жнівень...

# КАЛІ Б СЕСІЮ ЗДАВАЛІ...

## ...АПОШНІ З МАГІКАН

«МАЎЧЫЦЬ, усё адно як яму рот зашылі», — падумаў экзаменатар, але ўголас сказаў:

— Адказвайце, калі ласка, я слухаю...

Аднак чырванаскуры зацята маўчаў.

«Уляплю вось зараз два балы, адразу тады заспяваеш».

— Пераходзьце да другога пытання...

Выраз твару застаўся нязменным, усё роўна як у каменнага ідала.

Тут прафесар не вытрымаў, схапіў залікоўку, вывеў там вялікае «Выд.» і размашыста распісаўся.

«Разбяры тут, чаго ён маўчыць. Пэўна ж мае на тое прычыны. А раптам сам Чынганчук Вялікі Змей яму радня?»,—падумаў выкладчык, калі дзверы аўдыторыі зачыніліся за апошнім з магікан.

## ...АСТАП БЕНДЭР

— ХТО ВЫ? Я ніводнага разу не бачыў вас на лекцыях, — з падазронасцю зірнуў прафесар на маладога чалавека моцнага складу, у форменнай фуражцы пажарніка, з доўгім шалікам на шыі.

— Мой тата быў турэцкі паднявольны, — канец шаліка ўзмыў пад столь і схаваўся недзе за спіной. — Якая няўважлівасць, прафесар. Вы яшчэ скажаце, што не прысутнічалі на сустрэчы з сынам легендарнага Ота Шміта, дзе я расказваў пра свайго гераічнага тату? Ну вось бачыце, ужо прыгадалі. Вы ж не будзеце выказваць сумненні ў маім глыбокім веданні вашага прадмета...

Аднак прафесар быў няўмольны. Праз хвілін трыццаць дзверы за Астапам зачыніліся.

— Не, Шура, гэта не Рыа-дэ-Жанейра, — падміргнуў Бендэр Балаганаву і энергічна пакрочыў у дэканат за накіраваннем на пераздачу...

**В. ПЯРУН.**


**БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ**

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

7 чэрвеня 1984 г.

АТ 07716 Зак. 958.

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар В. П. ВАРАБ'ЁЎ